# Вачыма мастака

Яўген СІНІЧЭНКА

**У сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" з вялікім ажыятажам прайшоў вернісаж маладога мастака Аляксандра Даманава "Вочы ў вочы".**

Як заўважыў сам аўтар, работы падбіраліся не адной тэматычнай накіраванасці. Гэта было заўважана пры ўваходзе ў выставачную залу: тут і біблейскі сюжэт укрыжавання Хрыста, і футурыстычныя нацюрморты, і пераасэнсаваная аўтарская рэпрадукцыя "Чорнага квадрата". Але асаблівую, знакавую каштоўнасць уяўляў сабой партрэт Міхаіла Савіцкага, славутага беларускага мастака і настаўніка самога Аляксандра. І хаця ў экспазіцыю ўвайшлі не толькі новыя работы А. Даманава, але і яго карціны мінулых гадоў, гэта не пазбавіла агульную атмасферу свежасці і нейкай ідэйнай навізны, што асабліва ярка выявілася ў творы "Hi-Tech".

— Не лічу, што ўвасабляю ідэі смерці, разбурэння або стварэння. Гэта проста маё бачанне навакольнага свету на дадзены момант, — кажа мастак. — І я хачу, каб глядач убачыў свет маімі вачамі, каб ён паглядзеў на мяне такога, які я ёсць. У гэтым і заключаецца сутнасць назвы выстаўкі.

На вернісажы выступіў народны мастак Беларусі, графік і жывапісец Георгій Паплаўскі. Ён адзначыў, што Аляксандр Даманаў — вельмі таленавіты малады мастак, яго работы ў змяшанай тэхніцы прымушаюць задумацца пра навакольны свет. Асабліва такі роздум будзе карысны для падрастаючага пакалення.

Між іншым, гэта першая персанальная выстаўка Аляксандра ў Мінску. Раней ён прадстаўляў свае работы за мяжой (Японія, Германія). Мастак з'яўляецца стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі і ўваходзіць у маладзевую секцыю Беларускага саюза мастакоў.

Выстаўка працягнецца да 30 верасня.